# Свята паяднанасці

*Рэльефы фасадаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Фрагмент правага рэльефа «Класікі». Аўтарскі калектыў: м.вінаградаў, в.крамарэнка, А.Дранец, у.Крываблоцкі, А.Лучыновіч. Разьбапа граніце з пакрыццём. 2005.*

**Самы буйны за апошнія гады будаўнічы аб'ект у краіне - Нацыянальная бібліятэка Беларусі - абяцае стаць цікавым прыкладам сінтэзу розных відаў выяўленчага мастацтва, якія ўпрыгожаць экстэр'еры і інтэр'еры будынка. Канцэпцыя аздаблення была распрацавана прадстаўнікамі Беларускага саюза мастакоў сумесна з Беларускім саюзам архітэктараў, Беларускім саюзам дызайнераў і зацверджана спецыяльным саветам па распрацоўцы канцэпцыі мастацкага афармлення будынка Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Савет быў сфарміраваны Міністэрствам культуры, у яго склад увайшлі архітэктары, мастакі, дызайнеры, літаратуразнаўцы, прадстаўнікі Нацыянальнай бібліятэкі, Нацыянальнай акадэміі навук, іншых дзяржаўных установ. Узначаліў яго скульптар, заслужаны дзеяч мастацтваў РБ Іван Міско. Праца ідзе не адзін месяц, але гэта ўсё ж надта кароткі тэрмін для выпрацоўкі генеральнага рашэння па аздабленні бібліятэкі і ландшафту вакол яе, а, галоўнае, для яго рэальнага ўвасаблення ў канкрэтных творах жывапісу, графікі, скульптуры, манументальнага мастацтва, у габеленах, керамічных пано, вітражах. Наколькі складана было сінтэзаваць у межах аднаго архітэктурнага аб'екта такую вялікую колькасць разнастайных па тэматыцы, стылях, мастакоўскіх светапоглядах твораў, распавядаюць нашым чытачам член савета мастак-манументаліст, старшыня секцыі манументальна-дэкаратыўнага мастацтва БСМ Уладзімір Крываблоцкі і член аўтарскага калектыву мастак-манументаліст, сакратар секцыі манументальна-дэкаратыўнага мастацтва БСМ Анатоль Лучыновіч.**

Уладзімір Крываблоцкі: - Нагадаю, што ідэя стварыць новы сучасны будынак Нацыянальнай бібліятэкі нарадзілася 1 5 гадоў таму. І тады ж скульптар Алесь Дранец стаў пераможцам конкурсу на помнік Францыску Скарыну ў Мінску. Сімвалічна, што абодва праекты ствараліся паралельна і адначасна. Момант, калі мы ўсе даведаліся, што помнік Скарыну будзе стаяць менавіта каля новай бібліятэкі, я добра памятаю. Прапанову гэтую зрабіў Прэзідэнт Беларусі А.Лукашэнка, прадстаўнікі Міністэрства культуры зачыталі яго ліст на пасяджэнні экспертнай камісіі. У якім дакладна месцы будзе стаяць помнік - у той час не вызначалася. Гадоў 6 - 7 на чарцяжах бібліятэкі стаяла






кропка - месцазнаходжанне помніка першаасветніку, - якую адразу паставілі архітэктары В.Крамарэнка і М.Вінаградаў. Калі ж пачалося рэальнае будаўніцтва бібліятэкі і «кветка» будынка пачала распускацца ў прасторы, мастакі адчулі, што ім ёсць да чаго рэальна прыкласці свае сілы.

Агульная канцэпцыя ўключае афармленне экстэр'ераў і аздабленне інтэр'ераў бібліятэкі. Вонкавыя манументальныя плоскасці ўваходнай зоны, выкананыя ў выглядзе старонак разгорнутай кнігі, аздоблены мастацкімі рэльефамі на тэмы развіцця сусветнай і беларускай пісьменнасці.

Помнік першадрукару, як вядома, ужо адліты ў бронзе, вышыня - амаль 6 метраў. Ён захаваў залацісты колер бронзы, пастамент выраблены з граніту. Усё гэта зроблена, каб стварыць арганічны кампазіцыйны ансамбль з навакольным асяроддзем і парталам будынка. Першапачаткова планавалася паставіць помнік перад фасадам бібліятэкі. Але там постаць Скарыны аказвалася супраць сонца, і таму прачытваўся толькі яе сілуэт. Прынятае канчатковае рашэнне - размясціць помнік асіметрычна ўваходу - аказалася больш правільным. Помнік адразу трапляе на вочы кожнаму, хто падыходзіць да бібліятэкі, і ў той жа час успрымаецца цэласна з рэльефамі фасада.

Усе рашэнні па афармленні бібліятэкі прымаліся саветам, зыходзячы з канкрэтных умоў. Тэрміны былі вельмі сціслыя, і мы баяліся паказаць сябе з-за гэтага неўлепшым выглядзе.У конкурсе на мастацкую ідэю афармлення ўваходных «крылаў» удзельнічалі 1 5 мастакоў. Выйграў наш аўтарскі калектыў: М.ВІнаградаў, В.Крамарэнка, А.Дранец, А.Лучыновіч і я.

Я маю дасвед працы ў інтэр'ерах, Анатоль Лучыновіч займаўся манументальнымі працамі. Тут мы аб'ядналі нашы намаганні, каб зрабіць буйны аб'ект. Лагічна ў наш аўтарскі калектыў увайшоў і Алесь Дранец, тым больш што помнік Скарыну трэба было ўвязаць з навакольным асяроддзем, з элементамі мастацкага афармлення фасадаў будынка. Важна было стварыць арганічны дыялог паміж сучаснай мовай архітэктуры і сімволікай беларускай мінуўшчыны. Архітэктары праектавалі бібліятэку як дрэва ведаў, якое расло і ўрэшце расквітнела. Гэтую ідэю мы ўлічылі пры распрацоўцы рэльефаў для фасадных «крылаў». Мы свядома адмовіліся ад традыцыйнай выяўленчай мовы - ад фігур: афармленне фасадаў не павінна пераважаць, перашкаджаць цэльнаму ўспрыманню постаці Скарыны.

На левым «крыле» асноўнай стала тэма сусветнай культуры, правая прысвечана тэматыцы старадаўняй Беларусі. Вельмі дапамог вопыт А.Лучыновіча, майстра адмысловай падачы шрыфтоў, на якіх, па сутнасці, будуецца асноўны пластычны вобраз.

Анатоль Лучыновіч: - Распрацоўвалі ідэі мы разам з супрацоўнікамі бібліятэкі. Многа было разнастайных прапаноў па выяўленчым шэрагу. Пачыналі з таго, што проста закампаноўвалі пэўныя шрыфтавыя групы, у якіх прысутнічалі нават пісьмёны інкаў. Але глыбокага сэнсу гэтыя словы не неслі. Урэшце знайшлі кампазіцыю з фрагментам сусвету, як яго ўяўлялі ў XVI стагоддзі, тым больш што сам Скарына займаўся астраноміяй. Доўга шукалі выказванні, прапаноўвалі словы Арыстоцеля, радкі з Бібліі. І вось разам з Галінай Уладзіміраўнай Кірэевай, загадчыцай аддзела рэдкай кнігі Нацыянальнай бібліятэкі, знайшлі фразу са скарынаўскай Бібліі: «Да совершенен будет человек божнй». Бібліятэка звярнулася да пасольстваў, і фраза была перакладзена на васемнаццаць моў свету. Выбіралі мовы распаўсюджаныя, еўрапейскія, прысутнічаюць таксама арабская, кітайская, іўрыт і г.д. Такі падыход дазволіў нам адлюстраваць групы алфавітных сістэм розных народаў у іх гістарычным развіцці. Парадак размяшчэння надпісаў вызначаўся мастацкім спалучэннем розных графічных сістэм. Варыянты напісання літар таксама распрацоўваліся ўдумна, праз першакрыніцы - па выданнях Бібліі і Новага Запавету. Правільнасць напісання правяралася Інстытутам мовазнаўства НАН РБ, спецыялістамі Лінгвістычнага універсітэта і БДУ (кафедрай іудаістыкі).

На правым баку «крылаў» за аснову кампазіцыі ўзяты выявы Ме-






*Макет аздаблення інтэр'ераў атрыумуітрох кальцавых калідораў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Аўтарскі калектыў: м.вінаградаў, В.Крамарэнка, А.Дранец, У.Крываблоцкі, А.Лучыновіч, І.Лукін, я.вінаградаў. 2005.*



сяца і Сонца - Скарынавых знакаў, сілуэты якіх выразна падкрэслілі рух плоскасці. Кампазіцыя прысвечана беларускай і славянскай пісьменнасці і складаецца з літар алфавіта, якія выкарыстоўваліся ў Беларусі ў розныя стагоддзі. Мы імкнуліся паказаць шматфункцыянальнасць, шматмоўнасць і поліэтнічнасць гісторыі і культуры Беларусі, закраналі пісьменную культуру краіны IX - першай паловы XIII ст., духоўнае жыццё Вялікага княства Літоўскага, перыяд існавання Рэчы Паспалітай і знаходжання Беларусі ў складзе Расійскай імперыі. Выказванні найбольш вядомых асветнікаў і філосафаў якраз прыпадаюць на згаданыя перыяды. У рэльефе можна прачытаць словы Кірылы Тураўскага, Францыска Скарыны, Міколы Гусоўскага, Сымона Буднага, Францішка Багушэвіча, Янкі Купалы, Якуба Коласа. Мы ўзнавілі выказванні ў напісанні, набліжаным да аўтарскага. Ёсць у нас таксама фраза, напісаная арабскай графікай, але на беларускай і польскай мовах. Гэта даніна павагі да асіміляваных татараў Беларусі.

Форма манументальных плоскасцяў уваходнага партала будынка надзвычай складаная, закампанаваць у іх выявы і літары аказалася няпроста, таму перыяд эскізнай падрыхтоўкі быў доўгі. Спачатку мы шукалі дыяганаль, спосабы перадаць рух і засяроджанасць адначасова, кампанавалі модулі са знакаў і слоў. Зноў жа, і тут мы адышлі адзвыклай выяўленчай мовы, прапанавалі фармальнае рашэнне з вялікай тэматычнай насычанасцю. Атрымаўся арнамент з літар і тэкстаў, які максімальна наблізіўся да асэнсавання сутнасці такой установы, як бібліятэка. Дапамаглі і архітэктары: яны прапанавалі ўпрыгожыць арнамент літарамі - як у Александрыйскай бібліятэцы. Але нам хацелася пайсці глыбей, вызначыць тэму, стварыць вобразную кампазіцыю, насычаную сімволікай, і адначасова арнаментарны дыван - толькі гэта можа доўга трымаць увагу гледача. Тое, што атрымалася, сёння задавальняе і савет, і кіраўніцтва бібліятэкі. Разам з Раманам Сцяпанавічам Матульскім, дырэктарам бібліятэкі, Аленай Ерамееўнай Даўгаполавай, намеснікам дырэктара, і Галінай Уладзіміраўнай Кірэевай мы прыйшлі да высновы, што можна будзе каля нашых «крылаў» наладжваць спецыяльныя экскурсіі для чытачоў.

«Крылы» выкананы з пліт (100 х 50 х 1 5 см) нешліфаванага светлага граніту, на якія наносіцца разьба глыбінёй 3,5-8 см. Мы зрабілі аўтарскія кардоны, а брыгада майстроў займалася непасрэдна разьбой па граніце адразу на аб'екце.

У.К: - На адным з пасяджэнняў савета ўзнікла думка, каб той жа аўтарскі калектыў распрацаваў ландшафт вакол будынка. Нацыянальная бібліятэка падначалена планіровачным патрабаванням Генеральнага плана развіцця сталіцы і галоўным уваходам звернута да праспекта Незалежнасці. Ландшафт вакол будынка задумваўся як парк, дзе можна будзе размяшчаць фігуратыўную мастацкую пластыку, прадметы матэрыяльнай культуры (рэльефы літар і знакаў) - стала альбо часова. Тут могуць быць і малая пластыка, і тэматычныя праекты, і дэкаратыўныя рэчы, тут можна праводзіць чытанні, наладжваць інтэлектуальныя гульні, праводзіць скульптурныя пленэры. Нас чакае вялікая праца, бо эскізны праект аздаблення навакольнай тэрыторыі яшчэ не распрацоўваўся.

А.Л.: - Афармленне Нацыянальнай бібліятэкі становіцца сапраўдным святам мастацтва: над аздабленнем інтэр'ераў ужо працуе больш за 60 творцаў - графікі, жывапісцы, манументалісты, скульптары.

У.К.: - Канцэпцыя ўнутранага









афармлення бібліятэкі прадугледжвае размяшчэнне асобных твораў у зоне атрыуму, а таксама ў прасторы кальцавых калідораў на двух паверхах стылабату. Асабіста я быў зацікаўлены ў тым, каб у інтэр'ерах зрабіць дыхтоўную, сур'ёзную экспазіцыю з творамі выяўленчага, манументальнага, прыкладнога мастацтва. У зоне атрыуму мастацкія акцэнты нясуць сем манументальных рэльефных пано з роспісамі. Пра іх распавяду пазней. Два паверхі кальцавых калідораў аддаюцца мастакам для пастаяннай экспазіцыі ў міжваконных праёмах, каля ўваходаў у чытальныя залы. Спецыяльна для гэтага былі спраектаваны архітэктурныя рамы. На трэцім паверсе плануецца выставачная зала. На самым версе кнігасховішча, дзе аглядная пляцоўка, прапаноўваецца размясціць некалькі прыгожых карцін з беларускімі краявідамі. Нацыянальная самабытнасць нашай культуры стала асновай сюжэтнага развіцця мастацкіх ідэй будучых твораў. Гэта факты гісторыі, паданні, казкі, святы і абрады, арнаментальныя матывы, героі літаратурных твораў. Але трактоўка сюжэтаў дастаткова вольная, праз алегорыі і сімвалы.

Экспазіцыя будзе пабудавана па модульным прынцыпе. У якасці модуля выступаюць спецыяльныя метала-серабрыстыя рамы з падсветкай. Канфігурацыя рам аднолькавая, прамавугольная, вышыня іх аднолькавая (190 см), даўжыня розная - для габеленаў, напрыклад, да 335 см, для жывапісных палотнаў - да 215см. Плануецца некалькі жывапісных серый. Мастацкія творы будуць проста інсталявацца ў гатовыя рамы, сцены вакол якіх абліцаваны керамічнай пліткай прыгожага вохрыстага колеру (60 на 120 см). Выключэнне - скульптурныя рэльефы, якія будуць выстаўляцца без рам. Скульптары павінны ўлічваць вагу сваіх твораў, біраць матэрыялы, якія апрацоўваюцца не вельмі доўга. Для інтэр'ераў ужо пішуцца жывапісныя палотны, распрацоўваюцца эскізы габеленаў, скульптурных рэльефаў, энкаўстык, металічных вырабаў. Такі варыянт афармлення забяспечыць прасторава-вобразную цэльнасць экспазіцыі, а з іншага боку - разнастайнасцьтэхнік, манер, стыляў, тэматык. Модульны прынцып выгадны яшчэ і тым, што ён дазваляе ствараць экспазіцыю паралельна з тэхналагічным цыклам будаўніцтва. Мы плануем, што да адкрыцця экспазіцыі будзе зроблена ў матэрыяле да 30 працэнтаў мастацкіх твораў. Астатнія паказаны ў кардонах.

Але ёсць і цень неспакою. Ідэя выкладзена вельмі прыгожа, форэскізы экспертным саветам Міністэрства культуры прыняты, але як урэшце будуць выглядаць творы такіх вялікіх памераў - невядома. На нашых плячах ляжыць груз агромністай адказнасці за вынік.

Адразу пасля распрацоўкі генеральнага рашэння афармлення будынка бібліятэкі экспертны савет звярнуўся да Беларускага саюза мастакоў з прапановай падрыхтаваць эскізныя варыянты аўтарскіх твораў. Было вырашана не абвяшчаць агульнага конкурсу - не разыгрываць такі важны праект «у латарэю», бо, звычайна, конкурс не выяўляе вялікага таленавітага пласта мастацкіх напрацовак. Старшыням секцый БСМ прапанавалі адабраць лепшых,

*Мастацкія прапановы форэскізаў дляатрыуму ікальцавых калідораў першага ідругога паверхаў утзхніках ляўкас, рэльеф, габелен, энкаўстыка. 2005.*







найбольш вядомых мастакоў, якія б маглі стварыць цікавыя эскізы, распрацаваць важкія тэмы, перавесці іх у матэрыял. Быў прыняты шэрагтвораў манументальнага мастацтва, дэкаратыўна-прыкладнога (габелены), скульптурныя кампазіцыі, жывапісныя работы. Рэкамендавана таксама набыць габелен А.КІшчанкі «Зорка Венера». У перспектыве габелен з'явіцца ў адной з залаўбібліятэкі. Плануеццатаксама насыціць прастору калідораў атрыуму скульптурнай пластыкай. ТКІршына будзе рабіць керамічныя пано для кавярні бібліятэкі - гэта ўжо другая чарга афармлення. Знойдзена, на мой погляд, удалае месца для графікі - на першым паверсе, у холе перад канферэнц-залай, там запланаваны падсветка і рамы. Графічныя лісты будуць сабраны ў фрыз вышынёй 120 см, шырыня вольная. Падабраны і калектыў выдатных графікаў, сярод якіх і вядучыя майстры, і творчая моладзь. У перспектыве графічныя лісты, універсальная пластычная мова для інтэр'ераў, будуць таксама ўпрыгожваць кабінеты і холы бібліятэкі.

Многія з эскізаў ужо паказаны савету і ўхвалены. Сярод аўтараў - суквецце выдатных нашых майстроў. Будзе прадстаўлены жывапіс ГВашчанкі, Л.Шчамялёва, УТоўсціка, В.Касцючэнкі, З.ЛІтвінавай, А.Ксяндзова, УГанчарука, А.Шлегель; графіка В.Шаранговіча, А.Кашкурэвіча, ППаплаўскага, М.Басалыгі, УВІшнеўскага; скульптуры А.Арцімовіча, І.МІско, УСлабодчыкава, А.Фінскага, К.Селіханава, А.Заспіцкага; манументальныя творы С.Рабашчука, Ю.Багушэвіча, С.Дамарада, А.Сушы, В.ЦІханава, К.Камала; габелены В.Крывашэвай, ІБелавусавай, В.Грыдзінай, Н.Сухаверхавай, Л.Пятруль, Л.Густавай, ГКрываблоцкай. Чатыры класічныя вітражы робяць В.Пазняк і малады мастак В.Лагоўскі. І гэта далёка не поўны пералік.

Усе ведаюць галоўную ўмову: калі работа не атрымаецца, пасля пераводу ў матэрыял будзе выглядаць спаба, мы з ёю развітаемся і запросім іншага мастака. Няхай ніхто не крыўдуе, бо гэта - справядліва. У пастаяннай экспазіцыі, якую будуць бачыць беларусы і замежныя госці, павінны быцьтворы прафесійныя і яркія, да таго ж - зробленыя ў класічнай манеры.

Унутры атрыуму мастацкімі акцэнтамі стануць рэльефныя пано з роспісамі, прапанаваныя аўтарскім калектывам: А.Лучыновіч, А.Дранец, С.Катовіч, І.Лукін, В.Крамарэнка, М.ВІнаградаў, Я.ВІнаградаў, УКрываблоцкі. Шэсць з іх прысвечаны культуры і гісторыі абласцей Беларусі. Па вышыні яны займаюць прастору на ўсе тры паверхі (9 *м),* шырыня розная - ад 3,7 да 5 метраў. Чытач, які ўвойдзе ва ўнутраную прастору атрыуму, убачыць іх цалкам. Цэнтральнае пано знаходзіцца на ўзроўні другога паверха і ўвасабляе вобраз сталіцы Беларусі. Тэхніка выканання пано - ляўкас, рэльеф, роспіс. Напісаныя па частках у майстэрні, яны будуць манціравацца непасрэдна ў бібліятэцы.

Існавала многа розных ідэй для гэтых пано: прапаноўвалася зрабіць яркія, насычаныя па колеры энкаўстыкі, пазней узнікла думка зрабіць мазаікі са скульптурнымі рэльефамі. Апошняя ідэя спадабалася прадстаўнікам бібліятэкі і савету. Але тэхніка гэтая складаная для выканання, да таго ж знайсці матэрыялы - асабліва смальту, якую Беларусь сама не вырабляе, - амаль немагчыма. Мы спыніліся на манументальных роспісах светлымі фарбамі. Асноўныя колеры - белы і залаты, трошкі падсвечаныя блакітам. Пано павінны атрымацца чыстымі па гучанні, урачыстымі і ўтой жа час празрыстымі. Распрацоўвалі мы такі варыянт у традыцыях беларускага іканапісу, дзе фон ажурна выразаўся і распісваўся.

Атрыум - гэта рымская калонная зала. У стварэнні візуальнага вобразу мы адштурхнуліся ад вертыкалі калон - галоўных чыннікаў усёй кампазіцыі. Яны ствараюць чысціню сгылю, яны трымаюць кнігі - крыніцу ведаў. Для кожнай вобласці мы падабралі постаці славутых людзей і нашых сучаснікаў, элементы пазнавальных архітэктурных помнікаў, характэрныя пейзажы. Напрыклад, пано Брэсцкай вобласці: унізе - прыгожы краявід, вышэй - даваеннае аблічча Брэсцкайкрэпасці, сілуэт славутага палаца-крэпасці ў Косаве, яшчэ вышэй - гербы раёнаў. У кнігах запісаны прозвішчы славутых людзей гэтай зямлі. Такі прынцып мы захаваем ва ўсіх астатніх пано...





Спадзяёмся, што мэта, якую мы сабе паставілі на пачатку распрацоўкі агульнага плана афармлення бібліятэкі: забяспечыць параднасць і прыгажосць інтэр'ераў будынка, - будзе дасягнута. І будынак бібліятэкі сапраўды стане для ўсіх беларусаў святам паяднанасці архітэктуры і мастацтва.

***Падрыхтавала***
***НаталляШаранговіч.***
***ФотаА.Спрынчана.***